*А. І. Бабко*

# ПАРАДАКСАЛЬНАЕ МЫСЛЕННЕ І ЯГО ЗНАЧЭННЕ Ў КАНТЭКСЦЕ ІНТЭГРАЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ СІСТЭМ У ЕЎРОПЕ

Інтэграцыйныя працэсы ў галіне адукацыі, як і ва ўсякай іншай сферы грамадскага жыцця, могуць адбывацца паводле розных схем, мадэляў і прынцыпаў. Патрэбы ўсяго грамадства і інтарэсы непасрэдных удзельнікаў і творцаў гэтых працэсаў будуць задаволены найлепшым чынам, калі інтэграцыя нацыянальных адукацыйных сістэм у супольную еўрапейскую адукацыйную прастору забяспечыць поўную і эфектыўную рэалізацыю высокага духоўнага патэнцыялу дадзенай сферы. У сувязі з гэтым грунтоўную важнасць набывае правільнае вызначэнне прыярытэтных мэт і кірункаў, дзеля якіх і на якіх павінны разгортвацца згаданыя працэсы. Недапушчальна, каб сярод гэтых мэт адсутнічала фарміраванне ў навучэнцаў творчых схільнасцей – і на ўзроўні тэарэтычнага мыслення, і ў практычнай сферы.

У кантэксце вырашэння такой задачы істотнае значэнне набывае мадэляванне ў рамках навучальнага працэсу сітуацый, якія выклікаюць да жыцця парадаксальнае мысленне, г.зн. мысленне, што здзяйсняецца на ўзроўні невыпадковай супярэчнасці. Сітуацыі падобнага кшталту з непазбежнасцю ўзнікалі і ўзнікаюць у працэсе разгортвання навуковых пошукаў (як і духоўных пошукаў увогуле), яны маюць крызісны характар: неаднаразова правераныя і як быццам надзейныя метады і мадэлі пазнавальнай дзейнасці не прыносяць поспеху. Больш за тое, іх ужыванне цягне за сабой найвастрэйшыя і на першы погляд неадольныя супярэчнасці. Кінуты ў небяспечную стыхію парадаксальнасці, чалавечы дух міжволі аказваецца ва ўмовах, што патрабуюць інтэнсіфікацыі адпаведных пошукаў, падштурхоўваюць да новых, нестандартных рашэнняў, атмасфера апарэйтычнай сітуацыі нацэльвае на творчы падыход да кагнітыўных праблем. Гісторыя чалавечага пазнання дае, значыцца, багаты і разнастайны матэрыял для мадэлявання такіх пазнавальных сітуацый у рамках навучальнага працэсу. Да найважнейшых перадумоў эфектыўнага выкарыстання дадзенага матэрыялу належыць, безумоўна, і тэарэтычны аналіз звязанай з парадаксальным мысленнем праблематыкі, які не можа быць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дастаткова сур'ёзным і глыбокім без прыцягнення філасофскага пазнавальнага інструментарыя.

У навуковай літаратуры тэрмін «парадокс» знаходзіць дастаткова шырокі ўжытак, ягоны топас не абмяжоўваецца толькі сферай логікі і матэматыкі. І гэта не выпадкова, бо пазнавальныя сітуацыі, што змушаюць да парадаксальнага мыслення, узнікаюць не толькі ў гэтых дзвюх галінах навукі (ды і наогул не абмяжоўваюцца абсягам навуковага пазнання). Парадоксы, што паўстаюць у розных духоўных сферах, маюць пэўную адметнасць, пэўную спецыфіку. К.Попер, напрыклад, даводзіць, што дастаткова распаўсюджаны ў заходняй філасофскай традыцыі погляд, паводле якога моўны аналіз з'яўляецца адзіным праўдзівым метадам філасофіі, грунтуецца, апроч іншага, і на блытаніне, якая мае месца праз атаясамліванне структуры філасофскіх і лагічных парадоксаў. Памылковасць такога атаясамлівання, на думку К. Попера, відавочная: усе лагічныя парадоксы выяўляюць пэўную рэфлексіўнасць – скіраванасць моўнага выразу на самога сябе, – што адсутнічае ў структуры філасофскіх парадоксаў [2, с.16].

Пры ўсёй разнастайнасці і адметнасці праяў парадаксальнага мыслення ў розных духоўных сферах яны выступаюць тым не менш менавіта як формы парадаксальнасці і выяўляюць, значыцца, агульныя рысы. Знешняя агульная характарыстыка ўсіх відаў парадаксальнага мыслення – іх ашаламляльны псіхалагічны эфект. Такі стан рэчаў заканамерны, бо парадокс – гэта супярэчнасць, што ўзнікае там, дзе яе найменш чакаюць. Яна пагражае агульнапрынятым уяўленням і ставіць пад сумнеў неаднаразова правераны пазнавальны інструментарый.

Наяўнасць гэтай знешняй характэрнай рысы парадаксальнага мыслення яшчэ не дазваляе весці гаворку аб тым, што мы маем справу з сур'ёзным выпадкам парадаксальнасці. Магчыма, мы толькі гуляем у яе [4, с.1053], і пры ўважлівым разглядзе высвятліцца, што парадокс мае ўяўны характар, г.зн. выступае (паводле тэрміналогіі, уведзенай У.Куайнам) як верыдыкальны ці фальсідыкальны. Верыдыкальны парадокс мае месца ў тым выпадку, калі тэза, што падаецца абсурднай з пункту гледжання агульнапрынятых уяўленняў, выяўляецца пры грунтоўным аналізе як цалкам адпаведная гэтым уяўленням, г.зн. губляе бачнасць супярэчлівасці; пра фальсідыкальны парадокс гаворка вядзецца тады, калі тое, што нас бянтэжыць, сапраўды з'яўляецца абсурдным, г.зн. губляе бачнасць праўдзівасці [3, с.1–6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Істотнай характарыстыкай усіх відаў парадаксальнага мыслення з’яўляецца, безумоўна, так або інакш выяўленая супярэчлівасць разгортвання думкі. Калі адпаведная супярэчнасць закранае важныя моманты нашай тэарэтычнай або практычнай дзейнасці і пры гэтым не можа быць пераадолена наяўнымі сродкамі, дык гэта азначае, што мы сутыкнуліся з сур’ёзным выпадкам парадаксальнасці, найважнейшымі формамі якой з’яўляюцца антыноміі і апарыі. Антыноміі – гэта супярэчнасці, што паўстаюць у межах пэўнай тэарэтычнай сістэмы на аснове карэктных у лагічных адносінах разважанняў, прычым і на карысць тэзы, і на карысць антытэзы прыводзяцца аднолькава важкія аргументы. Што да апарый, дык на дадзены момант гэтым тэрмінам у навуковай літаратуры абазначаецца найперш пазнавальная сітуацыя, калі дзве ўнутрана несупярэчлівыя тэорыі выяўляюць непрымірымую супярэчнасць пры ўсякай спробе спалучыць іх.

Як указвалася вышэй, антыноміі і апарыі не могуць быць пераадолены пры дапамозе наяўнага пазнавальнага інструментарыя. Неабходна ўдакладніць, аднак, што наяўных сродкаў недастаткова для іх грунтоўнага вырашэння; менавіта яно патрабуе прынцыпова новых падыходаў, метадаў, пазнавальных працэдур, у выніку чаго пазнанне выходзіць на новы ўзровень свайго самаразвіцця. Але магчымы і іншы варыянт іх вырашэння, які дазваляе захаваць статус-кво ў адпаведнай галіне навукі. Гэта паліятыўнае вырашэнне, прыкладам якога можа служыць забарона ўжываць пэўныя моўныя выразы ў дачыненні да саміх сябе.

Відавочна, што крэатыўны патэнцыял, які змяшчае ў сабе феномен парадаксальнага мыслення, мае ўніверсальны характар: ён можа быць задзейнічаны ва ўсякім нацыянальна-культурным асяродку і пры выкладанні самых розных навуковых дысцыплін. Таму цалкам натуральна разглядаць гэты феномен у кантэксце інтэграцыі нацыянальных адукацыйных сістэм у Еўропе. Але інтэграцыйныя працэсы (у тым ліку і ў галіне адукацыі) не павінны зводзіцца да аднабаковай уніфікацыі і стандартызацыі. Важна, каб інтэграцыйныя мадэлі ўлічвалі і забяспечвалі бесперашкоднае развіццё нацыянальна-культурнай адметнасці. Адпаведныя магчымасці неабходна шукаць, знаходзіць і выкарыстоўваць у кожным канкрэтным выпадку, на кожным напрамку разгортвання інтэграцыйных працэсаў. Калі, маючы на ўвазе згаданы прынцып, звярнуцца да звязанага з парадаксальным мысленнем праблемнага поля, дык такія магчымасці ў дачыненні да нашай беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

самабытнасці можна выявіць у творчасці Э. Фрома. Справа ў тым, што ён указваў на глыбокую сувязь паміж парадаксальнай логікай і прыхільнасцю да талерантнасці [1, с.91–98]. Ідэалагічная і рэлігійная талерантнасць – гэта неад’емная характэрная рыса менталітэту беларускага народа. Ці не стаіць за ёй і схільнасць да парадаксальнага мыслення? Такое пытанне можа быць пастаўлена і разгледжана ў межах любога парадаксальнага дыскурсу, пры мадэляванні парадаксальнай пазнавальнай сітуацыі любога кшталту.

Такім чынам, вывучэнне феномена парадаксальнага мыслення з’яўляецца важным і запатрабаваным у кантэксце стварэння эфектыўнай адукацыйнай сістэмы ў Еўропе ў цэлым і ў паасобных краінах. Парадоксы выяўляюцца ў розных формах і могуць быць па-рознаму вырашаны. Відавочна, што духоўныя пошукі чалавека і чалавецтва, навуковыя даследаванні, спосабы і мадэлі арганізацыі адукацыйных сістэм павінны арыентавацца на грунтоўнае вырашэнне сапраўдных, ненадуманых парадоксаў. Такой арыентацыі духоўных працэсаў пакліканы паспрыяць і філасофскі аналіз дадзенай праблематыкі.


1. *Фромм, Э.* Искусство любить. Исследование природы любви / Э. Фромм. – М.: Педагогика, 1990. – 158 с.

2. *Popper, K. R.* Logik der Forschung / K. R. Popper. – 10. Aufl. – Tübingen: J.C.B. Mohr (Paul Siebeck), 1994. – 481 S.

3. *Quine, W. V.* The Ways of Paradox / W. V. Quine // “The Ways of Paradox” and Other Essays. – Cambridge, Massachusetts, London: Harvard University Press, 1976. – P. 1–18.

4. *Schäfer, K.* Paradox / K. Schäfer // Handbuch philosophischer Grundbegriffe / Hrsg. von H. Krings, H.-M. Baumgarten, C.Wild: in 6 B. – Bd. 4. – S. 1051–1059.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ